# ТРЫ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ: ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**У. Е. Снапкоўскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Независимости, 4, 220030, Мінск, Беларусь, ulsnap44@inbox.ru*

У артыкуле даецца перыядызацыя гісторыі знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь, пачынаючы з 1991 г. і заканваючы канцом 2023 г. Аўтар прааналізваў асноўныя этапы фарміравання і развіцця знешняй палітыкі незалежнай Беларусі і коратка апісаў іх характэрныя рысы. Вопыт трох дзесяцігоддзяў самастойнага развіцця Беларусі паказвае, што ў яе гісторыі выразна вылучаецца знешнепалітычная дзейнасць парламенцкай рэспублікі і прэзідэнцкай рэспублікі. Рубяжом паміж імі з’яўляецца 1994 г., калі прэзідэнтам краіны быў абраны А. Р. Лукашэнка. Аўтар падзяляе прэзідэнцкі перыяд у знешнепалітычнай гісторыі суверэннай Беларусі на чатыры этапы і адзначае іх характэрныя рысы. Падводзяцца вынікі дзейнасці беларускай дзяржавы ў галіне знешняй палітыкі, дыпламатыі і знешнеэканамічнай дзейнасці (эканамічнай дыпламатыі).

***Ключавыя словы:*** Рэспубліка Беларусь; знешняя палітыка; дыпламатыя; незалежнасць; перыядызацыя гісторыі знешняй палітыцы; нацыянальныя інтарэсы.

# THREE DECADES OF INDEPENDENCE: PERIODIZATION OF THE HISTORY OF THE FOREIGN POLICY OF THE REPUBLIC OF BELARUS

**U. E. Snapkouski**

*Belarusian State University,*
*Niezaležnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus ulsnap44@inbox.ru*

The article provides a periodization of the history of the foreign policy of the Republic of Belarus, starting from 1991 and ending at the end of 2023. The author analyzed the main stages of the formation and development of the foreign policy of independent Belarus and briefly described their characteristic features. The experience of three decades of independent development of Belarus shows that the foreign policy activities of the parliamentary republic and the presidential republic clearly stand out in its history. The turning point between them is 1994, when A. Lukashenka was elected president of the country. The author divides the presidential period in the foreign policy history of sovereign Belarus into four stages and notes their characteristic features. The results of the activities of the Belarusian state in the field of foreign policy, diplomacy and foreign economic activities (economic diplomacy) are summarized.

***Keywords:*** Republic of Belarus; foreign policy; diplomacy; independence; periodization of the history of foreign policy; national interests.

Больш чым 30-гадовы перыяд развіцця Беларусі па шляху незалежнасці дае падставы для падвядзення вынікаў і вызначэння перспектыў далейшага руху. Улічваючы вопыт трох дзесяцігоддзяў самастойнага развіцця Беларусі, вылучым этапы фарміравання і развіцця яе знешняй палітыкі, якая выступае галоўным прадметам даследавання ў артыкуле. Аўтар у публікацыях, прысвечаных першаму, другому і трэцяму (ужо ў абагульненым выглядзе) дзесяцігоддзям знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, прадставіў яе перыядызацыю, заснаваную на тыпе палітычнага рэжыму, які кіруе краінай. У гэтым плане выразна вылучаецца знешнепалітычная дзейнасць парламенцкай рэспублікі і прэзідэнцкай рэспублікі [1, с. 6—10].

*Парламенцкі перыяд (1991 — ліпень 1994 гг.),* маючы на ўвазе яго кароткатэрміновасць і арганічную цэласнасць, не падзяляецца на больш кароткія часовыя адрэзкі. Асноўны змест гэтага няпоўнага трохгадовага адрэзка часу складае працэс міжнароднага прызнання Рэспублікі Беларусь, яе выхаду на міжнародную арэну як незалежнай дзяржавы, усталявання дыпламатычных адносін з большасцю дзяржаў планеты, пашырэння актыўнасці Беларусі на міжнароднай арэне з улікам новага дзяржаўна-палітычнага статусу. Безумоўным прыярытэтам гэтага перыяду з'яўлялася канцэнтрацыя намаганняў на развіцці адносін з краінамі СНД, у першую чаргу, з Расіяй, і з развітымі краінамі Захаду. Вельмі важным і гістарычна значным быў уклад Беларусі ва ўмацаванне міжнароднай бяспекі ў сувязі з яе добраахвотнай адмовай ад ядзернага статусу і далучэннем да іншых міжнародных пагадненняў у галіне ядзернага і звычайнага раззбраення [2, с. 9—18]. Дасягнутыя ў гэтай галіне рашэнні былі рэалізаваны ў пачатковы перыяд прэзідэнцкага праўлення, калі ў лістападзе 1996 г. расійскія стратэгічныя ракеты былі выведзеныя з тэрыторыі краіны і Беларусь дэ-юрэ стала бяз'ядзернай дзяржавай.

Наступны 29-гадовы прэзідэнцкі перыяд у знешнепалітычнай гісторыі суверэннай Беларусі падзяляецца на чатыры этапы.

*Першы ахоплівае 1994—1999 гг.* Гэта пяцігодка актыўнай інтэграцыйнай палітыкі з Расіяй. Этап пачынаецца з прыходам да ўлады Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі і завяршаецца дзвумя найважнейшымі падзеямі: падпісаннем Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы 8 снежня 1999 г. і зменай Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі 31 снежня 1999 г. Гэтыя гады таксама з'яўляюцца часам умацавання ўсходняга вектара знешняй палітыкі беларускай дзяржавы праз стварэнне больш цесных інтэграцыйных аб'яднанняў з Расіяй і іншымі краінамі СНД пры адначасовым згортванні палітычнага дыялогу з краінамі Захаду і пашырэнні супрацоўніцтва з краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Тады ж нарадзілася паняцце «шматвектарнасці», якое стала пазней асновай і візітнай карткай знешняй палітыкі беларускай дзяржавы.

*Другі этап знешнепалітычнай дзейнасці беларускай дзяржавы ў перыяд прэзідэнцкага праўлення ахоплівае 2000—2014 гг. і яго можна назваць пачаткам «шматвектарнай палітыкі»*. Тэрмін «шматвектарная палітыка» ўпершыню быў агучаны ў дакладзе А. Р. Лукашэнкі на Першым Усебеларускім з’ездзе 19 кастрычніка 1996 г., які сказаў: «З улікам нашага геапалітычнага становішча адзінай эфектыўнай можа быць толькі шматвектарная, збалансаваная знешняя палітыка» [3, с. 82]. У далейшым тэрмін «шматвектарнасць» стаў трактавацца ў выступах беларускага прэзідэнта і іншых кіруючых дзеячаў краіны, а ўслед за імі і ў працах беларускіх і замежных даследчыкаў як адзін з ключавых прынцыпаў знешняй палітыкі Беларусі. Што тычыцца аўтара, то ён больш схіляецца да таго, каб лічыць шматвектарнасць знешнепалітычнай стратэгіяй афіцыйнага Мінска ў 2000—2020 гг., якая ахоплівае другі і трэці этапы знешняй палітыкі першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Другі этап завяршыўся ў 2014 г. У гэтыя гады адбылося замацаванне суверэннага статусу Беларусі і пачала ажыццяўляцца шматвектарная знешняя палітыка. Краіна здабыла рысы геапалітычнага суб’екта, здольнага самастойна вызначаць і рэалізоўваць сваю знешнюю палітыку ў адпаведнасці з нацыянальнымі інтарэсамі [4, p. 38].

*З 2014 г. да жніўня 2020 г. працягваўся трэці этап знешнепалітычнай дзейнасці першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які можна назваць часам «больш гнуткай, збалансаванай і незалежнай знешняй палітыкі»*. На гэтым этапе палітыка шматвектарнасці стала набываць больш рэальныя і адэкватныя рысы і набліжацца да сапраўднага значэння гэтага слова, якое разумеецца як збалансаванае развіццё адносін з усімі геаграфічнымі вектарамі знешняй палітыкі дзяржавы. У гэтыя гады ішоў працэс развіцця Беларуссю сваёй ідэнтычнасці.

*Трэці этап знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі адрозніваецца ад папярэдняга больш паслядоўным і паспяховым курсам рэалізацыі шматвектарнай палітыкі.* Калі на працягу другога этапу афіцыйнаму Мінску давялося перажыць два крызісы ў адносінах з Захадам (2004—2006 і 2010—2012 гг.), то 6-гадовы трэці этап характарызуецца як самы паспяховы перыяд у гісторыі знешняй палітыкі прэзідэнцкай рэспублікі. Беларусь пазбавілася ад заходніх санкцый, стала перамоўнай пляцоўкай па нармалізцыі адносін паміж Расіяй і Украінай, прыняла шэраг важных міжнародных форумаў (саміт «нармандскай чацвёркі», Парламенцкую асамблею АБСЕ), умела балансавала паміж Масквой і Брусэлем, нарошчвала патэнцыял узаемадзеяння з Кітаем і іншымі ключавымі краінамі і рэгіёнамі «далёкай дугі», праводзіла актыўную эканамічную дыпламатыю, якая стала візітнай карткай беларускай дзяржавы [5, с. 7—9].

*Чацвёрты этап знешнепалітычнай дзейнасці прэзідэнта пачаўся ў канцы 2020 г. і працягваецца ў цяперашні час.* Вынікі прэзідэнцкіх выбараў (жнівень 2020 г.) прывялі да абвастрэння адносін афіцыйнага Мін-

ска з суседнімі дзяржавамі (Польшчай, Літвой, Латвіяй), калектыўным Захадам у цэлым. Пагоршыліся адносіны з Украінай, якая не прызнала палітычных рэалій у краіне. Расія адназначна прыняла бок дзеючага Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі, аказаўшы яму палітычную, дыпламатычную, эканамічную, інфармацыйную падтрымку [6, с. 7].

Падзеі 2020—2023 гг. змянілі напрамкі палітыкі шматвектарнасці. Гэтыя змены мелі вымушаны характар, абумоўлены празмерна вострай рэакцыяй Захаду на дзеянні афіцыйнага Мінска, і не азначае адмовы беларускага кіраўніцтва ад прынцыповага і доўгачасовага курсу на развіццё адносін па ўсіх вектарах і азімутах як геаграфічных, так і тэматычных. Ва ўмовах узрослай турбулентнасці ў Еўропе Беларусь вымушана адысці ад правядзення палітыкі сітуацыйнага нейтралітэту і ўзмацніць інтэграцыю з Расіяй у галіне геапалітыкі, ваеннай стратэгіі і абароны, дзяржаўнага кіравання, эканомікі і культуры. Адмова ад імкнення да нейтралітэту і зняцце палажэння аб бяз'ядзернасці зафіксаваныя ў новай рэдакцыі Канстытуцыі, прынятай 27 лютага 2022 г.

Болей чым 30-гадовы вопыт самастойнага існавання паказвае, што Рэспубліка Беларусь працягвае свой няпросты, цярністы шлях развіцця як незалежнай еўрапейскай дзяржавы. Яе знешняя палітыка ўнесла важкі і прызнаны ўклад ва ўмацаванне міжнароднай і еўрапейскай бяспекі і працэс раззбраення, стаўшы першай у свеце дзяржавай, якая добраахвотна адмовілася ад ядзернай зброі. Устаноўлены добрасуседскія адносіны з суседнімі дзяржавамі, развіваюцца інтэграцыйныя сувязі з постсавецкімі краінамі, з некаторымі буйнымі і ўплывовымі дзяржавамі (Расія і Кітай) наладжана стратэгічнае партнёрства. Знешняя палітыка, зарыентаваная на абарону бяспекі і забеспячэнне свабоды дзеяння ў на сусветнай арэне, стала больш прагматычнай, а дзейнасць беларускай дыпламатыі — больш прафесійнай [7; 8].

Разам з тым патэнцыял шматвектарнай знешняй палітыкі не ўдалося рэалізаваць у поўнай меры, а пасля 2020 г. заходні вектар аказаўся адкінутым. Ва ўмовах перафарматавання сусветнага парадку Беларусь застаецца прыхільнай курсу на аднаўленне канструктыўнага дыялогу з Захадам без вылучэння папярэдніх умоў. Палітыка шматвектарнасці працягвае заставацца фірмовым знакам дзейнасці Беларусі на міжнароднай арэне, рэалізуючыся на ўсходнім і паўднёвым напрамках у сферы міжнароднай бяспекі, эканамічнай дыпламатыі, гуманітарнага і культурнага супрацоўніцтва.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Снапковский, В. Е. Анализ внешней политики Республики Беларусь : пособие / В. Е. Снапковский. — Минск : БГУ, 2021. — 243 с.

2. Кравченко, П. Беларусь на переломе: восстановление государственности и дипломатический прорыв в мир [Электронный ресурс] / П. Кравченко // Беларус. думка. — 2016. — № 12. — С. 9—21.

3. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў. Т. 8 (1996—2000 гг.) / склад. У. Е. Снапкоўскі [і інш.] ; старшыня редкал.: С. М. Мартынаў. — Мінск : БДУ, 2008. — 639 с.

4. Snapkouski, U. E. Foreign policy of the Republic of Belarus: milestones and priorities [Electronic resource] / U. E. Snapkouski // Journal of Belarusian State University. International relations. — 2021. — N 1. — P. 36—43.

5. Макей, В. На службе народа и государства / В. Макей [Электронный ресурс] // Беларус. думка. — 2017. — № 3. — С. 3—10.

6. Российско-белорусское сотрудничество: время стратегических решений / Ассоциация внешнеполитических исследований имени А. А. Громыко, Ин-т Европы РАН. — М.; Минск, 2021. — 38 с.

7. Внешняя политика Республики Беларусь в новом мире: выступление Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко на совещании с руководителями загранучреждений 22 июля 2004 г. [Электронный ресурс] // Президент Республики Беларусь. — 24.07.2004. — Режим доступа: https://president.gov.by/ru/events/vystuplenie-prezidenta-respubliki-belarus-aglukashenko-vneshnjaja-politika-respubliki-belarus-v-novom-mire-na-5837. — Дата доступа: 15.12.2022.

8. Макей, В. На службе народа и государства [Электронный ресурс] / В. Макей // Беларуская думка. — 2017. — № 4. — С. 3—13. — Режим доступа: https://beldumka.belta.by/isfiles/000167_448473.pdf. — Дата доступа: 30.01.2023.